Сямейная газета

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

24 ЖНІЎНЯ 2017 г. ЧАЦВЕР №162 (28526)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Раннія немаўляты**



**Асуджаныя за наркотыкі**

СТАР. 4



**Пяць пытанняў пра грашовыя пераводы**

СТАР. 13

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Людміла РЭУЦКАЯ, начальнік упраўлення фармацэўтычнай інспекцыі і арганізацыі лекавага забеспячэння Міністэрства аховы здароўя:**

*«Цэны на айчынныя і замежныя лекавыя сродкі зніжаны па шэрагу пазіцый па выніках маніторынгу фармрынку. Пытанне забеспячэння цэнавай даступнасці лекавых сродкаў знаходзіцца на пастаянным кантролі ў Міністэрстве аховы здароўя. Работа, якая праводзіцца ў гэтым кірунку, дазволіла дабіцца ўстойлівага зніжэння цэн на лекі. Так, па інфармацыі Нацыянальнага статыстычнага камітэта, на працягу 2017 года назіраецца зніжэнне сярэдніх рознічных цэн на лекавыя сродкі: індэкс спажывецкіх цэн за студзень—жнівень 2017 года да снежня 2016 года склаў 98,55%».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 24.08.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9319 | ▲ |
| Еўра | 2,2733 | ▼ |
| Рас. руб. | 0,0326 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0755 | ▼ |

ISSN 1990 - 763X

# Лазневы дзень



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Вёска Даўгінава, Вілейскі раён.

■ Тэхналогіі поспеху

## Хуткія, экалагічныя, свае

### Беларускія навукоўцы прэзентавалі распрацоўкі ў сферы электратранспарту

**Максімальная хуткасць — 110 кіламетраў за гадзіну, разгон да «сотні» — за дзевяць з паловай секундаў, магутнасць — 80 конскіх сіл. Магчыма, не самыя выдатныя паказчыкі для звычайнага сучаснага аўтамабіля, але ключавое слова тут «звычайнага». Размова ідзе пра распрацаваны ў Аб'яднаным інстытуце машынабудавання Нацыянальнай акадэміі навук першы беларускі электрамабіль, эксперыментальны экзэмпляр якога днямі паказалі кіраўніцтву краіны і журналістам. Машына створана на базе серыйнага Geely SC7 беларускай зборкі (сімвалічны момант — асновай для распрацоўкі паслужыла самая першая «легкавушка», якая сышла з канвеера прадпрыемства «БелДжы»). Уся кампанентная база цягавага электрапрывода створана ў нашай краіне.**

СТАР. 3



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Супрацоўнікі Інстытута машынабудавання расказваюць пра сваю распрацоўку намесніку прэм'ер-міністра Уладзіміру СЯМАШКУ.

■ Горадабудаўніцтва

## ПЕРАПРАФІЛЯВАНЫЯ ЗАВОДЫ І НОВЫЯ КВАРТАЛЫ

### Як будзе развівацца Мінск

**Напярэдадні 950-годдзя сталіцы старшыня камітэта архітэктуры і горадабудаўніцтва Мінгарвыканкама Павел ЛУЧЫНОВІЧ расказаў пра тое, якія буйныя праекты будуць рэалізаваныя ў найбліжэйшы час, што чакае прыватны сектар і якім чынам кожнаму можна будзе паўплываць на паляпшэнне свайго горада.**

### Горад для прыгожай працы

Кірункі забудовы сталіцы заклаў прыняты ў мінулым годзе генеральны план. Аднак цяпер распрацоўваюцца яшчэ два маштабныя дакументы: правілы забудовы і правілы сядзібнай забудовы, якія будуць арыентаваныя менавіта на рэаліі жыцця ў сталіцы. Як растлумачыў Павел Лучыновіч, будуць аналізавацца агульнарэспубліканскія нормы і мяняцца тыя, якія не падыходзяць для Мінска як для горада з асаблівым статусам для Беларусі. Напрыклад, павялічыцца колькасць машына-месцаў, пераўтворыцца аблічча дваравой тэрыторыі, у адрозненне ад іншых гарадоў ужо ёсць абмежаванні па максімальнай шчыльнасці забудовы.

Апошнія некалькі гадоў асабліва часта ўздымалася тэма зносу прыватнага сектара. Многія дамы дзясяткі гадоў знаходзіліся «пад умоўным зносам», гэта значыць лёс іх канчаткова не быў вызначаны, але некаторыя тыпы рамонтных работ выконваць усё роўна забаранялася. Галоўны архітэктар Мінска запэўніў, што больш такога не будзе, рашэнні будуць прымацца аператыўна і людзі змогуць давесці да ладу сваё жыллё.

Пры гэтым зменены нормы і па аб'ёмах зносу. Калі раней ліквідавалася 70% нізкапавярховай забудовы і толькі 30% захоўвалася, то цяпер гэтых лічбы памяняліся месцамі. Тым не менш нязгодных і зараз дастаткова. Каб выслухаць меркаванне мясцовых жыхароў, праводзяцца грамадскія абмеркаванні, на якіх прэзентуюць дэталёвыя планы, за апошні час іх колькасць вырасла ў разы. Праўда Павел Лучыновіч прызнаў, што грамадскае абмеркаванне, умоўна кажучы, у актавай зале школы — гэта не самы зручны фармат. Таму ў планах — пераняць досвед Расіі, Украіны і Польшчы і ў якасці пляцоўкі выкарыстоўваць у тым ліку і інтэрнэт.

СТАР. 2